по белорусской народной сказке «Дамок». После показа сказки воспитателем, детям было предложено поиграть с пальчиковыми куколками. Каждый ребёнок смог примерить на себя роль понравившихся героев сказки. В дальнейшем по содержанию белорусской народной сказки «Дамок» провели игры-драматизациии с использованием настольного театра и инсценирование сказки самими детьми. Вместе с детьми отрабатывали умение выполнять действия, о которых говориться в сказке; развивали умение эмоционально и заинтересованно следить за развитием действий при показе настольного театра; повторяли знакомые фразы из сказки; выполняли действия, о которых говориться в сказке. Дети последовательно и выразительно рассказывали сказку «Дамок», передавали эмоциональное состояние героев мимикой, жестами, телодвижением.

Для знакомства детей дошкольного возраста с социальными потребностями была выбрана белорусская народная сказка «Сынок-з кулачок». Перед чтением сказки была проведена беседа «Социальные потребности» в ходе которой с детьми повторили понятие «потребности человека», закрепили названия социальных потребностей и понятий «семья», «дети». После прочтения сказки провели беседу по её содержанию и сделали вывод о том, что всем нужна семья. Для закрепления полученных знаний вместе с детьми подготовили декорации и изготовили пальчиковые куколки некоторых героев сказки. Цикл занятий по белорусской народной сказке «Сынок-з кулачок» завершили показом пальчикового театра.

Важной задачей воспитателя дошкольного образования является формирование знаний детей об экономических понятиях в максимально доступной и увлекательной форме. Для этого нами были созданы замечательные интерактивные пособия — лэпбук. Лэпбук помогает детям дошкольного возраста по своему желанию организовать деятельность по изучаемой сказке и лучше понять её героев, что способствует повторению и закреплению пройденного материала. Наполнение лэпбука включает в себя разнообразные дидактические игры: «Расскажи сказку», «Сложи пазл», «Кто лишний», «Что за чем», «Найди тень». Также туда входят загадки, пословицы и поговорки. Дошкольники играют в дидактические игры самостоятельно или с помощью воспитателя. Можно выбрать задания в соответствии с возможностями каждому ребёнка (одним — кармашки с карточками по данной теме, а другим детям — задания, которые подразумевают рассмотреть картинки и ответить на вопросы воспитателя).

**Заключение.** Таким образом, народная белорусская сказка несёт в себе огромный воспитательный потенциал, являясь эффективным средством формирования у детей дошкольного возраста основных экономических знаний и умений, а также их эмоционального развития. В работе по содержанию сказки необходимо предлагать детям не только познавательный материал, но и использовать творческие задания, варианты театрализованные и дидактические игры, в которых формирование знаний детей об экономических понятиях будет проходить в максимально доступной и увлекательной форме.

**Список цитируемых источников**

1. Вучэбная праграма дашкольнай адукацыі / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2022. — 383с.

УДК 373.24

**Карловіч Валянціна Васільеўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячы сад № 79 г. Брэста», Брэст, Рэспубліка Беларусь, valuscha.24@gmail.com*

## ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ДЗЯЦЕЙ СЯРЭДНЯГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ ПРАЗ СТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАМОЎНАГА АСЯРОДДЗЯ

У артыкуле разглядаецца праблема фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Асобую ўвагу аўтар удзяляе ўключэнню бацькоў у адукацыйны працэс. Актыўны ўдзел бацькоў разам з дзецьмі спрыяе зацікаўленасці ў стварэнні беларускамоўнага асяроддзя і ў сям'і, усведамлення працы па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей. Аўтар прыходзіць да высновы, што стварэнне беларускамоўнага асяроддзя, актыўнае ўжыванне беларускай мовы ва ўсіх відах дзейнасці спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

**Ключавыя словы:** самасвядомасць; беларускамоўнае асяроддзе; дошкольны ўзрост.

**Karlovich Valiantsina Vasilyevna**
*State Institution Education "Kindergarten № 79 of Brest", Brest, the Republic of Belarus, valuscha.24@gmail.com*

## THE FORMATION OF NATIONAL CONSCIOUSNESS OF PRESCHOOL CHILDREN BY CREATING A BELARUSIAN-LANGUAGE ENVIRONMENT

The article deals with the problem of the formation of national identity. The author pays special attention to the inclusion of parents in the educational process. The active participation of parents together with their children promotes the interest in creating the Belarusian-language environment in the family, the awareness of the work on formation of the national identity of children. The author concludes that

© Карловіч В. В., 2023

Репозиторий БарГУ

the formation of the Belarusian-speaking environment, active use of the Belarusian language in all kinds of activities contributes to the formation of national self-consciousness.
**Key words:** self-consciousness; Belarusian-language environment; preschool age.

**Уводзіны.** Кожны чалавек ужо з маленства павінен ганарыцца сваёй нацыянальнай прыналежнасцю, любіць сваю Радзіму. Для таго каб жыць асэнсавана і з пачуццём асабістай годнасці, патрэбна ведаць свае вытокі, захоўваць памяць пра мінулае свайго народа, шанаваць традыцыі, любіць Радзіму. І менавіта мы, дарослыя, нясём адказнасць за тое, каб з нашых выхаванцаў выраслі нацыянальна свядомыя асобы. Перыяд дашкольнага дзяцінства па псіхалагічных асаблівасцях найбольш спрыяльны для фарміравання асноў нацыянальнай самасвядомасці таму, што менавіта дзецям дашкольнага ўзросту ўласцівы эмацыянальная добразычлівасць, цікавасць да навакольнага свету, бязмерная даверлівасць да дарослых, імкненне паўтараць іх дзеянні. Умовы для паспяховага фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ствараюцца праз раўнапраўнае моўнае партнёрства паміж педагогам і дзецьмі, заснаванае на развіцці беларускага маўлення. Маўленчае развіццё дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі адбываецца ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Першай мовай, якой авалодваюць дзеці дашкольнага ўзросту, выступае руская. Пры гэтым далучэннне дзяцей да беларускай мовы адбываецца таксама даволі рана. Дзеці чуюць яе па радыё, тэлебачанні, ва ўстанове дашкольнай адукацыі (асобныя заняткі, святы). У выхаванцаў ствараюцца «жыццёвыя» ўяўленні пра рускую і беларускую мовы, назіраецца паступовае свядомае адрозненне гэтых моў. Білінгвальная адукацыя забяспечвае паўнавартаснае развіццё асобы дзіцяці сродкамі дзвюх моў і прадстаўленых імі культур. Дзіця-білінгв мае магчымасць інтэграцыі ў дзве моўныя культуры, што спрыяе як яго інтэлектуальнаму, так і псіхічнаму развіццю, пашырае і ўзбагачае мысленне і кругагляд выхаванца. Аднак авалоданне беларускай мовай найбольш эфектыўна спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці дзіцяці. Гэтаму ў цэлым адпавядае вучэбная праграма дашкольнай адукацыі. Адной з задач рэалізацыі вучэбнай праграмы з'яўляецца фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі [1, с. 196]. Важным прынцыпам выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту абвяшчаецца прынцып мульцікультурнасці — арыентацыі на засваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі. Незалежна ад моўнага рэжыму ўстановы дашкольнай адукацыі (рускага або беларускага) прадугледжваецца ажыццяўленне нацыянальна-культурнай сацыялізацыі дзіцяці, фарміраванне яго нацыянальнай самасвядомасці. У сучасных умовах значная ўвага адукацыйнай грамадскасці накіравана на адраджэнне нацыянальных традыцый і каштоўнасцей, таму што пакаленне, якое ўсведамляе сваю нацыянальную годнасць, шануе свае карані, беражэ і памнажае культуру свайго народа, з'яўляецца трывалым аплотам дзяржавы. Адной з асноўных задач адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятызму з дашкольнага ўзросту. Нацыянальнае выхаванне спрыяе далучэнню чалавека да самабытнай культуры, дапамагае маленькім беларусам усвядоміць сваю прыналежнасць да нацыі, багатай традыцыямі, звычаямі, дасягненнямі ў культуры, навуцы, адукацыі. Ад зместу нацыянальнага выхавання залежыць узровень і характар нацыянальнай самасвядомасці чалавека. Нацыянальная самасвядомасць з'яўляецца духоўным здабыткам асобы, складае маральную аснову яе жыццядзейнасці [2, с. 4]. Значную ўвагу праблеме фарміравання нацыянальнай самасвядомасці аказвалі Дз. М. Дубініна, Н. С. Старжынская, Н. В. Пралыгіна. Як адзначаюць даследчыкі, авалоданне беларускай мовай складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы дзіцяці, засваення ім нацыянальнай культуры, станаўлення нацыянальнай самасвядомасці. На жаль, сучасныя дзеці мала чуюць, яшчэ менш ужываюць беларускую мову, а далучыць дзяцей да нацыянальнай культуры, выхаваць сапраўднага патрыёта сваёй Радзімы, сфарміраваць у яго пачуццё сябе як беларуса без ужывання беларускай мовы вельмі складана. Такім чынам, с застаецца актуальным тварэнне беларускамоўнага асяроддзя ў дзіцячай установе, сям'і, а таксама розных відах дзейнасці.

**Асноўная частка.** Назіранні паказалі, што за мінулыя гады адбываліся вялікія змены ў адносінах людзей да нашай гісторыі, пераацэнка маральных каштоўнасцей. На жаль, у наш час матэрыяльныя каштоўнасці дамінуюць над духоўнымі, а ўяўленні аб дабрыні, вялікадушшы ў дзяцей часта бываюць скажонымі. Таксама ў сувязі з недастатковасцю ці нават адсутнасцю беларускамоўнай практыкі ў дзяцей на нізкім узроўні сфарміраваны камунікатыўныя якасці маўленчай дзейнасці: адзначаецца бедны слоўнікавы запас; маўленне дзяцей дашкольнага ўзросту знаходзіцца пад моцным уплывам рускай мовы; дзеці недастаткова ведаюць беларускія народныя традыцыі, гульні і святы; некаторыя педагогі не вельмі добра валодаюць роднай мовай, у сваёй працы мала выкарыстоўваюць сродкі вуснай народнай творчасці, малыя формы беларускага фальклору; большая колькасць бацькоў, дзеці якіх наведваюць установу дашкольнай адукацыі, увогуле не звяртаюцца да беларускай народнай культуры, беларускай дзіцячай літаратуры. З гэтай нагоды пачалася праца, на першым этапе быў вывучаны вопыт выхавальнікаў другіх устаноў дашкольнай адукацыі, публікацыі ў часопісе «Пралеска», метадычная літаратура па пытанні фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

На пачатковым этапе дзейнасць была накіравана на стварэнне развіваючага прадметна-навакольнага асяроддзя. Практыка паказала, што дзейнасць па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці дазваляе спалучаць працу з рознымі відамі дзейнасці, таму ўзбагачалася база ў розных цэнтрах. Стварылі

Репозиторий БарГУ

куток «Беларусь — мая Радзіма», у якім размясцілі рэчы з беларускай сімволікай (герб, сцяг, гімн, карта Рэспублікі Беларусь), кнігі «Мая Радзіма — Беларусь», «Герб, гімн, сцяг», альбомы «Брэст», «Гарады Беларусі», «Спадчына». У кніжным кутку з'явіліся ілюстрацыі беларускіх мастакоў А. Лось, В. Басалыгі, В. Коўтуна, Н. Селешчука, дыдактычныя гульні «З якой казкі герой», «Прадоўжы казку», кнігі беларускіх народных казак, альбомы «Прыказкі і прымаўкі», «Загадкі», «Калыханкі», «Пацешкі», «Моўныя хвілінкі». У тэатральна-гульнявым цэнтры былі арганізаваны тэатры на фланэлеграфе «Пшанічны каласок», «Зайкава хатка», «Пых»; тэатр на лыжках «Коцік, пеўнік і лісіца», «Каза-манюка». З дапамогай бацькоў пашыты і зроблены маскі і атрыбуты для інсцэніровак і драматызацый твораў. У мастацка-творчым цэнтры для выкарыстання дзецьмі прадстаўлены альбомы «Дэкаратыўнае мастацтва Беларусі», «Вырабы ганчарства», «Беларускі нацыянальны строй розных рэгіёнаў», «Архітэктурныя каштоўнасці» і інш., зроблена падборка карцін беларускіх мастакоў. Для выкарыстання ў рабоце былі зроблены дыдактычныя гульні для развіцця беларускага маўлення «Назаві правільна», «Скажы інакш» і інш., якія аб'яднаны ў «Картатэку гульняў па развіцці беларускага маўлення».

Такім чынам, стварэнне адпаведнага развіваючага прадметна-навакольнага асяроддзя ў групе стала адпавядаць мэце працы па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці ў выхаванцаў, з'явілася неабходным фактарам для ўсебаковага развіцця асобы дзіцяці, дапамагло павысіць якасць адукацыйнага працэсу. Адукацыйны працэс па дадзенай тэме прадоўжыўся на наступным этапе — асноўным. Работа з дзецьмі будавалася па прынцыпах паслядоўнасці і сістэматычнасці, інтэграцыі, праблематызацыі, пераемнасці. Сталі ўжываць беларускую мову ва ўсіх відах сумеснай дзейнасці, рэжымных момантах. Пачыналі з вітання і развітання, ужывання слоў ветлівасці, акцэнт рабіўся на тое, што так заўсёды гаварылі і гавораць сапраўдныя беларусы. Далей усе ўказанні, парады рабіліся на беларускай мове. Спачатку памочнік выхавальніка дубліраваў іх на рускай мове, з цягам часу патрэба ў дубліраванні адпала.

Ужыванне беларускай мовы актывізавалі і ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці. На занятках па адукацыйных вобласцях «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» і на іншых занятках па адукацыйнай вобласці «Дзіця і грамадства» адзін занятак у тыдзень праводзілі на беларускай мове, асабліва ў тыя тыдні, тэма якіх спрыяла такой замене: «Мой горад», «Сям'я», «Беларуская народная творчасць», «Цацкі», «Адзенне, абутак», «Лес: жывёлы, расліны, насякомыя» і інш. На гэтых занятках дзеці не толькі ўспрымалі інфармацыю на беларускай мове, але і ўсведамлялі сябе маленькімі беларусамі таму, што размова ішла пра бліжэйшае асяроддзе, тое, што знаходзіцца вакол нас. Таксама на занятках па адукацыйнай вобласці «Мастацтва» па маляванню, лепцы, аплікацыі зносіны з выхаванцамі ажыццяўляліся на беларускай мове там, дзе гэта было мэтазгодна, напрыклад: «Мы — ганчары», «Упрыгожым дыванок», «Пралеска», «Дзіцячы сад» і інш. Так мы вырашалі задачы па фарміраванні цікавасці да беларускага маўлення і станаўлення дзіцячай асобы ў межах нацыянальнай супольнасці, супольнасці беларусаў.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі наладжваецца сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць педагога і дзяцей у час спецыяльна арганізаванай, нерэгламентаванай, а таксама самастойнай мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей [3, с. 9]. Згодна з тэмай тыдня адбываліся зносіны, размовы, вырашэнне праблемных сітуацый, сітуацыйныя зносіны на беларускай мове. Напрыклад, тэма тыдня «Горад, вуліца, святлафор»; запланаваны зносіны па сітуацыі «Я згубіўся, што рабіць» (замацаванне свайго адрасу, імя, прозвішча бацькоў); «Запросім сяброў у госці» (арыентыроўка ў сваім мікрараёне, развіццё ўмення апісваць дарогу да свайго дома); «Што я бачыў, калі ішоў у дзіцячы сад» (развіццё назіральнасці, умення заўважаць прыгажосць у бліжэйшым асяроддзі) і г. д. Эфектыўна выкарыстанне ў зносінах беларускай лялькі, яна мае магчымасць уключацца ў дыялог у любы момант. Дзецям цікава вучыць ляльку таму, што яны ўмеюць самі, адчуваць сябе больш сталымі, тлумачыць і разважаць на розныя тэмы.

Паспяховасць намаганняў па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці можа быць дасягнута сродкамі вуснай народнай творчасці. Багацце нацыянальнай спадчыны адлюстравана ў казках, забаўлянках, прыказках і прымаўках, лічылках, загадках. Эфектыўнасць выкарыстання вуснай народнай творчасці магчыма дасягнуць з дапамогай метадаў і прыёмаў работы: сюрпрызны момант, незвычайны пачатак; праблемны характар становішча; гульнёвыя прыёмы; віктарыны, выставы адгадак; выкарыстанне прыказак, прымавак, малых форм беларускага фальклору для арганізацыі дынамічнай хвілінкі; творчыя заданні: «Намалюй, што ўявіў», «Прыдумай сам», «Упрыгож»; хатнія заданні «Пагуляй у дамашні тэатр», «Спытай у бабулі»; мультымедыйныя прэзентацыі; тэматычныя віктарыны, вечарыны, кірмашы; сумесныя з бацькамі святы.

Таксама цікава для выхаванцаў прымаць удзел у гульнях-драматызацыях, інсцэніроўках па творах вуснай народнай творчасці. Пачыналі з малых формаў твораў, знаёмых казак («Курачка Рабка», Муха-пяюха» і інш.). Выкарыстоўвалі атрыбуты, дэталі касцюмаў з адметнай нацыянальнай прыналежнасцю: саламяныя капелюшы, фартухі з беларускім арнаментам, кошыкі, свісцёлкі і г. д. Гэта дало магчымасць вырашыць задачы развіцця беларускага маўлення, раскрыць творчыя магчымасці дзяцей, фарміраваць цікавасць да народнай творчасці, у гульнёвай форме далучыць дзяцей да нацыянальнай культуры, адчуць сябе яе часткай.

На наш погляд, стварэнне беларускамоўнага асяроддзя толькі ва ўстанове дашкольнай адукацыі недастаткова, станоўчае дзеянне аказвае цеснае супрацоўніцтва з сям'ёй, актыўнае ўключэнне бацькоў у адукацыйны працэс. Спачатку ў кутку для бацькоў была размешчана інфармацыя на беларускай мове:

Рэпазіторый БарДУ

рэкамендацыі «Вячэрнія гульні з дзіцём», «Чытаем разам», «Выхоўваем маленькага беларуса» і інш. Кожны тыдзень размяшчаем беларуска-рускі слоўнік па тэме тыдня, вершы, загадкі, парады.

У рамках тыдня «Мой горад» дзеці атрымалі дамашняе заданне зрабіць з бацькамі герб свайго горада. Гэтым заданнем мы вырашалі адразу некалькі задач: гэта і патрыятычнае выхаванне дашкольнікаў, і ўключэнне бацькоў у адукацыйны працэс, і фарміраванне любові да сваёй малой радзімы, а таксама нацыянальнай самасвядомасці.

Актыўнае ўжыванне беларускай мовы выклікае цікавасць да народных традыцый, усведамлення сябе часткай беларускага народу. Сумесныя мерапрыемствы спрыяюць павелічэнню цікавасці бацькоў да выкарыстання беларускага фальклору і народных гульняў у выхаванні дзяцей і дапамагаюць усталяваць станоўчыя ўмовы для плённага супрацоўніцтва. Таму праводзіліся святы «Калядкі», «Гуканне вясны», «Кірмаш», «Беларусь — мая Радзіма», «Мой родны горад», «Мой край».

У тыдзень «Беларуская народная творчасць» бацькі разам з дзецьмі малявалі ілюстрацыі да беларускіх народных казак. Так мы падштурхнулі бацькоў да чытання ў сям'і твораў на беларускай мове.

Але на наш погляд найбольш эфектыўнай формай работы стаў бацькоўскі сход на тэму «Я — беларус! І тым ганаруся». Мэтай дадзенага сходу стала абуджэнне ў бацькоў павагі да сваёй Радзімы, роднай мовы, традыцый, народнай спадчыны. Актыўны ўдзел бацькоў разам з дзецьмі спрыяў зацікаўленасці ў стварэнні беларускамоўнага асяроддзя і ў сям'і, усведамлення працы па фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей. Нічога так не аб'ядноўвае сям'ю, як сумесная дзейнасць, якая спрыяе станоўчаму выніку ў выхаванні дзяцей. Таму мы прапанавалі бацькам вывучыць з дзецьмі вершы на беларускай мове, падрыхтаваць да іх касцюмы. Вынікі сумеснай працы былі прадэманстраваны на вечарыне «Конкурс чытачоў».

**Заключэнне.** Стварэнне беларускамоўнага асяроддзя спрыяе далучэнню дзяцей да беларускай нацыянальнай культуры, шанаванню сваёй Радзімы, жаданню насіць слаўнае імя — беларус. Планамерная сістэматычная работа, выкарыстанне разнастайных сродкаў выхавання, агульныя намаганні дзіцячага саду і сям'і, адказнасць дарослых за свае словы і ўчынкі далі станоўчыя вынікі і сталі грунтоўным падмуркам для далейшай работы па выхаванню нацыянальнай самасвядомасці асобы дзіцяці.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Учебная программа дошкольного образования [Электронный ресурс]. — Минск : Нац. ин-т образования, 2022. — Режим доступа: https://adu.by/images/2022/08/up-doshk-obrazov-rus-bel.pdf . — Дата доступа: 19.12.2022.

2. *Пралыгіна, Н. В.* Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту сродкамі вуснай народнай творчасці : дапаможнік для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкол. адукацыі / Н. В. Пралыгіна. — 2-е выд. — Мазыр : Белы Вецер, 2013. — 147 с.

3. *Дубініна, Д. М.* Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору / Д. М. Дубініна. — Мінск : Новое знание, 2016. — 208 с.

УДК 373.2

**Карсакова Татьяна Анатольевна**
*Государственное учреждение образования «Детский сад № 13 г. Могилёва», Могилёв, Республика Беларусь, detskisad13by@yandex.by*

# ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА В ИННОВАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧРЕЖДЕНИЯ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

В данной статье описывается опыт работы по гражданско-патриотическому воспитанию детей дошкольного возраста с использованием инновационных технологий, направленный на более полное удовлетворение потребностей родителей воспитанников и интересов детей в современном мире.

**Ключевые слова:** дошкольное детство; инновационная деятельность.

**Karsakova Tatiana Anatolyevna**
*State Educational Institution "Kindergarten №. 13 of Mogilev", Mogilev, the Republic of Belarus, detskisad13by@yandex.by*

# CIVIL AND PATRIOTIC EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN IN A PRESCHOOL EDUCATION INSTITUTION IN INNOVATIVE ACTIVITIES

This article describes the experience of work on civil and patriotic education of preschool children using innovative technologies aimed at more fully satisfying the needs of parents of pupils and the interests of children in the modern world.

**Key words:** preschool childhood; innovative activity.

© Карсакова Т. А., 2023

Репозиторий БарГУ